3. Беляева, Е. В. Три типа теории морали: «этика блага», «этика долга», «этика ответственности» / Е. В. Беляева // Философские традиции и современность: ежегодник. – 2013. – № 1 (3). – С. 74–80.

# ФІЛАСОФІЯ Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

*А. І. Бабко*

З лёгкай рукі Гегеля паняцце «канец» (ці «смерць»), дастасаванае да пэўнай духоўнай формы, зрабілася надзвычай папулярным і прыцягальным для філосафаў. Яно ўжываецца ва ўсё новых варыяцыях і набывае разнастайныя інтэрпрэтацыйныя нюансы. У сучасных умовах і філасофія (у цэлым, увогуле) далучылася да ліку тых духоўных сфер, якія разглядаюцца ў кантэксце самазавяршэння, самавычарпання, «паміраня». З пункту гледжання С. Хокінга і Л. Млодзінава, адпаведная сітуацыя выклікаецца да жыцця рэзкім умацаваннем пазнавальнашга патэнцыялу навукі, што зрабіла яе здольнай адказаць на пытанні, якія традыцыйна прылічваліся да абсягу філасофіі [4, с. 11]. У прынцыпова іншым ракурсе бачыў адпаведны феномен М. Хайдэгер. Яго падыход (які падаецца тут у рэканструкцыі Г.-Г. Гадамера) грунтуецца на спецыфічным бачанні сучаснай культуры, носьбіты якой (у пэўным падабенстве з «апошнімі людзьмі» Ф. Ніцшэ) не вылучаюцца асаблівай цікавасцю да пытання аб сутнасці быцця і займаюцца тэхнічным упарадкаваннем свету. У выніку ў ёй адчуваецца патрэба ў зусім іншым (у параўнанні з філасофскім) тыпе мыслення [3, с. 64–65].

Жывучы і працуючы ў філасофіі, вельмі складана ўзняцца да бесстаронняга разгляду дадзенай праблемы. Аднак, нават прыняўшы тэзу, згодна з якой сучаснасць мае павярхоўны і прагматычны характар, хіба можна ўявіць сабе, што ўвесь каласальны (канцэптуальны, інтэрпрэтацыйны, метадалагічны, аперацыянальны) патэнцыял, назапашаны сусветнай філасофскай думкай, будзе адкінуты чалавецтвам як непатрэбны без усякай спробы выкарыстаць яго – няхай сабе і ў нейкай тэхнічнай, знешняй, неарганічнай форме? І хіба прагматычнае грамадства можа дазволіць, каб адпаведны інструментарый не падтрымліваўся ў належным стане?

Аднак адмоўныя адказы на пастаўленыя вышэй пытанні (да якіх яны якраз і прызначаныя падштурхнуць), прызнаючы прысутнасць філасофіі ў жыцці грамадства, зусім не выключаюць разам з тым, што яна паступова губляе пазіцыі ў ім. Калі філасофская думка і не памерла, дык ці не выштурхоўваецца яна на перыферыю культурнага цэлага? Падобную пазіцыю адстойвае Р. Рорці, які ўказвае, што ў эпоху Асветы філасофская думка была актыўна задзейнічана для абгрунтавання новых, дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі грамадскага жыцця. І гэта мела

цалкам заканамерны характар, бо адсутнічаў адпаведны гістарычны досвед – найбольш эфектыўная форма вырашэння задач такога кшталту. У сучасных умовах чалавецтва ўжо валодае неабходным досведам, і абгрунтавальныя працэдуры «фундаменталісцкага» тыпу страцілі сваё значэнне (нягледзячы на тое, што некаторыя філосафы працягваюць дзейнічаць на стары манер). Даследчык даводзіць, што ў рэальных палітычных дыскусіях, што вядуцца ў ЗША, філасофскай аргументацыі не належыць практычнага ніякага месца [1, с. 222–225].

У фармальным плане гэты апошні момант, напэўна, цалкам адпавядае сапраўднасці. Узняцца да фармулёўкі палітычна-філасофскіх прынцыпаў і вядзення адпаведных дыскусій – задача надта няпростая, у дзейных шараговых палітыкаў для гэтага, як правіла, няма ні матывацыі, ні духоўнай энергіі. Адпаведную працу павінны рабіць прафесійныя філосафы. Аднак ці сапраўды адсутнічае філасофскі кампанент у палітычных дыскусіях, што адбываюцца ў ЗША або дзесьці яшчэ? Ці не зафіксуем мы ў іх, прыгледзеўшыся і прыслухаўшыся да іх працякання, імпліцытную прысутнасць філасофіі? Станоўчы адказ на апошняе пытанне падаецца легітымным і заканамерным. Сапраўды, разглядаючы пэўную палітычную праблему – збору падаткаў, напрыклад, – мы з неабходнасцю абапіраемся на цэлы шэраг грунтоўных філасофскіх дапушчэнняў (звязаных з ідэалам сацыяльнай і палітычнай справядлівасці, яго значэннем для рэальнага функцыянавання дзяржавы, яго суадносін з прынцыпам эканамічнай эфектыўнасці і г. д.). Гэтыя дапушчэнні набываюць, як правіла, «натуральны» характар у нашым светабачанні, яны не робяцца прадметам спецыяльнага аналізу, застаючыся незаўважанымі, і тым не менш яны прысутныя ў нашых развагах і задзейнічаны ў іх. Акрамя таго, неабходна падкрэсліць, што гістарычны досвед ні ў якім разе не можа быць ні сфарміраваны, ні актуалізаваны без чыннага ўдзелу філасофіі.

Не трэба думаць, аднак, што сучасныя філосафы заўжды бачаць месца, ролю і прышласць той сферы, якую яны прадстаўлюць, у жыцці грамадства зусім змрочнымі і бесперспектыўнымі. П. Слотэрдайк, напрыклад, якраз у пошуках М. Хайдэгера адкрыў тэндэнцыю да актыўнага ўваходжання філасофскай думкі ў розныя сегменты культуры. За Хайдэгеравымі тытанічнымі намаганнямі, скіраванымі на выяўленне сэнсу быцця, ён разгледзеў і аспект самапародыі, які вытлумачваецца ім як грунтоўны для сучаснага мыслення: цяпер «здольнасьць рабіцца сьмешным ёсьць паказьнікам таго, што філязофскае мысьленьне перастае адварочвацца ад астатняга сьвядомага жыцьця. Высокая крайнасьць вяртаецца ў нізкае, артадаксальнае ператвараецца ў парадаксальнае» [2, с. 235].

П. Слотэрдайк вылучыў блізкі яму і важны для яго трэнд у багатай палітры сучасных філасофскіх пошукаў. У іншых сістэмах філасофскіх каардынат ён не будзе разглядацца як найбольш пажаданы і плённы.

Акрамя таго, фаварызаваны ў яго абсягу спосаб непасрэднага ўплыву філасофіі на іншыя сегменты культуры зусім не з’яўляецца адзіна магчымым. Як сведчыць яе гісторыя, яна можа паўплываць на грамадства пры дапамозе правакацыйных, эпатажных формул, праз грунтоўную распрацоўку праектаў, датычных найважнейшых сацыяльных праблем (напрыклад, забеспячэння вечнага міру), праз прасоўванне ўтапічных мадэляў грамадскага ўладкавання і г. д. Хоць разам з тым трэба прызнаць, што ўвасабленне філасофскіх ідэй у эстэтычнай ці нават мастацкай форме належыць да найэфектыўнейшых шляхоў згаданага ўплыву.

Неабходна адзначыць, аднак, што непасрэднае і яўнае ўздзеянне філасофскага пошуку на іншыя духоўныя формы ні ў якім разе не дамінуе ў структуры іх узаемадачыненняў (прынамсі, у «спакойныя» перыяды гістарычнага развіцця). З іншага боку, каб уздзейнічаць на культуру – непасрэдна ці апасродкавана, – філасофія павінна развіць сапраўднае багацце глыбокіх думак, няўхільна ўмацоўваючы свой творчы патэнцыял. І ў сучасных умовах тут выяўляецца істотная праблема: філасофскі пошук разгарнуўся ў неаглядны спектр школ, канцэпцый, падыходаў і ідэй. Якія з іх з’яўляюцца найбольш дзейснымі і прадуктыўнымі? Кожны з нас (у падабенстве з П. Слотэрдайкам) мае свае прыхільнасці і прыярытэты. Магчымасць абіраць уласную пазіцыю і распрацоўваць яе дазваляе ўбачыць і падаць сітуацыю філасофскай (звыш)разнастайнасці ў станоўчым святле. І тым не менш гэта адзнака крызіснага характару сітуацыі ў сучасным філасофскім мысленні (пры гэтым будзем памятаць, што, з пункту гледжання М. Хайдэгера, узровень развіцця навукі вызначаецца яе здольнасцю ўзняцца да крызісу яе грунтоўных паняццяў [5, с. 9]).

Згаданы крызіс зусім не выпадковы. У грамадстве, напоўненым латэнтнымі і адкрытымі крызіснымі з’явамі, канфліктамі і калізіямі, прасякнутым глабальнымі і лакальнымі праблемамі, філасофская думка сутыкаецца з сур’ёзнымі выклікамі. Пакуль што яна не здолела з імі справіцца. Аднак разам з тым яна не спыніла сваёй інтэнсіўнай працы. Да якіх вынікаў гэтая праца прывядзе, пакажа час.

Такім чынам, у сучасных умовах філасофія зусім не страціла свайго грамадскага паклікання і сваёй запатрабаванасці. Гэтыя ўмовы спрыяюць яе самаразвіццю, ставячы перад ёй самыя высокія і складаныя задачы. І яна імкнецца іх вырашыць. Ніякая іншая духоўная форма (уключаючы навуку) не здолее ўзяць на сябе згаданае вырашэнне: кожнай з іх бракуе дзейсных канцэптуальных і аперацыянальных рэсурсаў і магчымасці абаперціся на магутную гістарычную традыцыю, што функцыянавала б на адпаведным узроўні. Таму грамадства не можа дазволіць, каб філасофія была страчаная ці занядбаная ў яго духоўным жыцці: смерць філасофіі азначала б яго ўласную смерць.

**Літаратура і крыніцы**

1. Рорці, Р. Дэмакратыя і філязофія / Р. Рорці // Arche. Пачатак. – 2007. – № 7–8. – С. 222–229.

2. Слотэрдайк, П. Прыйсьці на сьвет – прыйсьці да мовы. Франкфурцкія лекцыі / П. Слотэрдайк. // Arche. Пачатак. – 2005. – № 2. – С. 234–303.

3. Gadamer, H. G. Ende der Kunst? Von Hegels Lehre von dem Vergangenheitscharakter der Kunst bis zur Antikunst von heute / H. G. Gadamer // Das Erbe Europas / H. G. Gadamer. – 3 Aufl. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1995. – S. 63–86.

4. Hawking, S. W. Der große Entwurf: Eine neue Erklärung des Universums / S. W. Hawking, L. Mlodinow. – Reinbek: Rowohlt, 2010. – 192 s.

5. Heidegger, M. Sein und Zeit / M. Heidegger. – Tübingen: Niemeyer, 1967. – 437 s.

# ИЗМЕНЯЮЩИЕСЯ ГОРИЗОНТЫ ФИЛОСОФИИ ЗНАНИЯ В ЦИФРОВИЗИРУЮЩЕМСЯ ОБЩЕСТВЕ

*Е. М. Бабосов*

Сущность исследуемого процесса: цифровизация – целенаправленное, непрестанно обновляемое созидание цифровой картины окружающей реальности в формате, открывающем возможности компьютерной обработки полученных данных; это внедрение современных цифровых технологий в различные сферы жизни и производства.

Развитие и совершенствование теории цифровизации базируется на интенсивном применении методов дисциплинарности – междисциплинарности и трансдисциплинарнности в их синегретическом взаимоусилении в различных областях миропреобразовательной деятельности людей.

Управление и использование цифровых платформ представляет собой многогранный научно-технический, технологический общественно-политический, информационный и военно-оборонный процесс. В своей многогранной сущности и множестве конкретных проявлений этот процесс не сдерживают никакие – ни страновые, ни межконтинентальные, ни межкоалиционные, ни климатические границы.

Практикоориентированное использование цифровизированных технологий в производственной сфере существенно увеличивает производительность труда и качество выпускаемой продукции.

Образцом в этой сфере может служить функционирующий в Минске Парк высоких технологий, который недавно принял решение о регистрации в качестве резидентов 65 компаний. Причем более половины участников зарегистрировано в прошлом и в этом году.

Экспорт в 2020 году составил 2 млрд. 725 млн. долларов с темпоростом 125%. С 2017 по 2020 годы количество резидентов его